# Хакейныя «зоркі» запальваюцца тут!

**Сёння на малой пляцоўцы «Чыжоўка-Арэны» стартуе дзясяты міжнародны хакейны турнір «Кубак Прэзідэнцкага спартыўнага клуба»**

**Ужо па традыцыі ў лістападзе ў Мінску збіраюцца наймацнейшыя гульцы свайго ўзросту. У спаборніцтвах прымуць удзел юніёрскія зборныя (U-16 і U-17) з Беларусі, Латвіі, Славакіі і Расіі.**

Адзначым, што менавіта Кубак Прэзідэнцкага спартыўнага клуба з'яўляецца першым міжнародным турнірам па хакеі, які стаў праводзіцца ў нашай краіне на традыцыйнай аснове. Ён вядзе адлік сваёй гісторыі з 2007 года. У розны час на мінскі лёд у рамках гэтага турніру выходзілі сённяшнія «зоркі» сусветнага хакея — Яўген Кузняцоў, які стаў найлепшым бамбардзірам каманды НХЛ «Вашынгтон Кэпіталс», Артур Гаўрус і Яўген Лісавец, якія сёння абараняюць колеры мінскага «Дынама» і нацыянальнай зборнай Беларусі. А, напрыклад, удзельнік турніру 2010 года Дэніс Годла са Славакіі праз пяць гадоў стаў найлепшым варатаром маладзёжнага чэмпіянату свету. На гэтым турніры пачыналі свой шлях і шмат іншых вядомых спартсменаў.

Сёлета чакаецца асабліва ўпартая барацьба за кубак. Расіяне сабралі магутную каманду з гульцоў, якія выступаюць у сістэме клубаў Кантынентальнай хакейнай лігі. Беларуская дружына выступае разам з пачатку сезона ў Вышэйшай лізе чэмпіянату Беларусі. Славакі ўпершыню вязуць гульцоў адразу трох узростаў, каб нарэшце пазмагацца за трафей. Ростар дзеючых уладальнікаў кубка — латвійцаў — у асноўным складаецца з гульцоў «Рыгі-2000».

Нагадаем, турнір праходзіць па кругавой сістэме. У 2007, 2010—2013 гадах уладальнікамі кубка сталі хакеісты з Расіі. У 2008, 2009 і 2014 гадах перамогу атрымлівалі гаспадары спаборніцтваў.

Як і ў мінулым годзе, гульні можна будзе ўбачыць не толькі ўжывую (уваход на арэну вольны), але і на афіцыйным канале Прэзідэнцкага спартыўнага клуба на Youtube. Там будзе даступна прамая трансляцыя ўсіх паядынкаў турніру. Сёлета да малюнка матчаў дададуцца яшчэ і галасы вядучых беларускіх хакейных каментатараў.



Фота БЕЛТА.

**3 лістапада**

13.00 Расія — Латвія

15.25 Урачыстая цырымонія адкрыцця турніру

16.15 Беларусь — Славакія

**4 лістапада**

13.00 Славакія — Расія

16.15 Латвія — Беларусь

**5 лістапада**

13.00 Славакія — Латвія

16.15 Беларусь — Расія

Па заканчэнні апошняга матчу дня адбудзецца цырымонія ўзнагароджання, а таксама ўрачыстае закрыццё турніру.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

■ Падпіска-2017

Звязда. Да чытача з любоўю!

## АД УСЁЙ ДУШЫ!

**Насуперак лістападаўскай слоце мы зноў распачынаем шчырыя сустрэчы з чытачамі, якія так прыйшліся даспадобы сябрам нашай «Звязды».**
**Паверце, надвор'е — зусім не перашкода для таго, каб пабачыцца.**
**У наш імклівы час вельмі важна імкнуцца да таго, каб часцей вітаць адзін аднаго не па мабільніку ці ліставацца праз электронную скрыню, а зазірнуўшы ў вочы, апынуўшыся побач.**
**Прынамсі менавіта такім чынам мы і паступаем. Напярэдадні кожнага сезона распачынаем шпацыр па роднай Беларусі, дзе ў роднай газеты на роднай мове столькі сяброў. І, паверце, такія сустрэчы ладзім з вялікім задавальненнем.**

**Прызнаемся, падчас далёкіх падарожжаў па найпрыгажэйшых кутках нашай краіны неяк забываліся пра прысталічча, лічачы, што ўжо сюды абавязкова патрапім. Тым часам чытачы з Мінскага раёна справядліва дакаралі: маўляў, ніяк не завітаеце. Выпраўляем недахоп — заўтра пабачымся ў пасёлку Лясны, цэнтры Бараўлянскага сельсавета. 4 лістапада з 11 да 14 гадзін Дзень падпісчыка газеты «Звязда» адбудзецца ў аддзяленні паштовай сувязі «Лясны-2». Спадзяёмся, што, нягледзячы на апошні працоўны дзень перад вялікімі выхаднымі і «нялётнае» надвор'е, сустрэча будзе цёплая.**
**Заходзьце — запрашаем ад усёй душы!**

# БЭБІ-БОКСЫ-БУМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У адным з выпадкаў маладая дзяўчына хварэла на ВІЧ-інфекцыю. Яна не толькі свядома заразіла свайго сужыцеля, пра што ён нават не здагадваўся, але і забіла іх агульнае нованароджанае дзіця, прычым з асаблівай жорсткасцю: нанесла яму мноства колата-рэзаных ран. Абцяжарваючыя абставіны пацягнулі за сабой адно з самых суровых пакаранняў — 12 гадоў пазбаўлення волі. А студэнтка з Туркменістана нарадзіла дзіця проста ў пакоі інтэрната БДТУ, а потым выкінула яго ў смеццевы пакет. Як высветліла следства, зрабіла гэта яна не свядома, а пад уздзеяннем псіхатраўмуючай сітуацыі. Улічваючы змякчаючыя акалічнасці, яе адправілі ў турму на два гады.

Не хацела станавіцца шматдзетнай маці дзвюх дачок з Пухавіцкага раёна, якая забіла трэцяе дзіця.

## УВАГА, ДЗЕЦІ!

Падчас цяжарнасці і ў пасляродавы перыяд жанчына ў прынцыпе схільная да дэпрэсіўных станаў, а ва ўсіх гэтых выпадках будучыя маці не звярталіся па дапамогу да медыцынскіх спецыялістаў, нараджалі дома, у адзіноце, большасць з іх засталіся без падтрымкі мужчыны. Збег гэтых абставін мог справакаваць узнікненне часовых адхіленняў у паводзінах. Таму неабходна зрабіць усё, каб такі складаны працэс як роды праходзіў пад наглядам спецыялістаў.

Дарэчы, наладжана цеснае супрацоўніцтва міліцыі з медыцынскімі ўстановамі. Калі ніякай інфармацыі пра жанчыну, якая стаяла на ўліку і ўжо павінна была нарадзіць, няма — звесткі пра яе перадаюцца ў органы ўнутраных спраў для праверкі. Сістэма дзейнічае і наадварот: у тым выпадку, калі адразу не атрымалася выявіць асобу злачынцы, рассылаюцца запыты аб інфармацыі як у дзяржаўныя, так і ў прыватныя клінікі, у тым ліку і каб праверыць тых, хто планаваў перапыніць цяжарнасць, а пасля адмовіўся. Асаблівая ўвага надаецца нядобранадзейным сем'ям.

Паводле слоў спецыяліста, нароўні з тэмай пазбаўлення ад нованароджаных не менш важнай праблемай з'яўляецца забойства дзяцей і пакіданне іх у сітуацыі, небяспечнай для жыцця. Ва ўсіх на слыху справа аб гомельскіх «бацьках», дзіця якіх ператварылася ў мумію, ці пра жыхарку сталіцы, якая не пабаялася пакінуць немаўля сам-насам з галодным сабакам. Так што выратаванне дзяцей у першыя дні існавання — гэта справа гіпераважная, аднак далёка не адзіная: неабходна стварыць ім годныя ўмовы жыцця.

Што датычыцца раскрывальнасці такіх злачынстваў, то доля тут высокая: ад 75 да 100% у залежнасці ад года. Напрыклад, сёлета было зарэгістравана 3 выпадкі забойства немаўлят: усе злачынствы ўжо раскрытыя. Часам атрымліваецца напасці на след злачынцы і праз 5-10 гадоў. Так, нядаўна была закрытая справа 2004 года. Жанчыны, якія дома нараджаюць мёртвае дзіця, часта імкнуцца пазбавіцца ад яго, што, у выпадку выяўлення, можа пацягнуць за сабой разбіральніцтва. Значна лепш самастойна заявіць пра здарэнне, а ў ідэале, каб яго прадухіліць, — у абавязковым парадку да родаў звярнуцца да ўрача.

— Чалавечае жыццё — гэта найвышэйшая каштоўнасць, і трэба прыкладаць усе намаганні, каб яго захаваць. Калі бэбі-боксы дапамогуць выратаваць хоць бы некалькі немаўлят, іх неабходнасць бясспрэчная, — падкрэсліў Віктар Юзэфовіч.

## ШТО ТАКОЕ БЭБІ-БОКСЫ?

Бэбі-бокс — гэта спецыяльна абсталяваная ячэйка-калыска ў памяшканні медыцынскага або сацыяльнага цэнтра, у якой можна ананімна пакінуць немаўля. Для таго, каб гэта зрабіць, не трэба заходзіць унутр і з кім-небудзь мець зносіны: пакласці туды дзіця можна праз акно, як толькі дзверцы бэбі-бокса будуць зачыненыя, ва ўстанове пачуецца гучны сігнал, які абвяшчае аб з'яўленні новага адказніка. Асобу жанчыны, якая пайшла на такі крок, устанавіць немагчыма: побач не павінна быць ахоўы і відэакамер. У абсалютнай ананімнасці асноўнае адрозненне ад іншых спосабаў адмовы ад дзіцяці. Каля бэбі-боксаў традыцыйна размяшчаюць кантакты грамадскіх і рэлігійных арганізацый, якія могуць дапамагчы маці, калі яна ўсётакі перадумае.



Фота gorod.lv

**«Бэбі-бокс» у горадзе Валміера (Латвія) з'явіўся тры гады таму дзякуючы падтрымцы спонсараў. На той момант у Латвіі ўжо дзейнічалі «бэбі-боксы» ў Рызе, Ліепаі, Даўгаўпілсе, Рэзекне і Вентспілсе.**

Ідэя такога прыёмніка далёка не новая: у розных формах яны былі шырока рапаўсюджаны яшчэ ў сярэднія вякі. Першае «кола падкідышаў» было створана ў Італіі ў канцы XII стагоддзя. Для гэтых мэт выкарыстоўвалася цыліндрычная прылада, якая была ўманціравана ў вонкавую сцяну будынка. Пасля таго, як жанчына клала дзіця ўнутр, яна круціла цыліндр і немаўля аказвалася ўнутры манастыра або прытулку. Ролю апавяшчальніка выконваў званочак. Тады на такі крок жанчын штурхала ганьба за нараджэнне дзіцяці па-за шлюбам, цяпер — нежаданне браць на сябе адказнасць.

У некаторых краінах Еўропы бэбі-боксы шырока распаўсюджаныя да гэтага часу, напрыклад, у Германіі. У іншых краінах, як у Вялікабрытаніі і Бельгіі, яны пад забаронай, а ў Францыі і наогул ёсць паняцце — ананімныя роды. У суседняй Расіі першыя бэбі-боксы з'явіліся ў 2011 годзе, што выклікала масу спрэчак у грамадстве, якія не сціхаюць да гэтага часу. Цяпер вядзецца абмеркаванне поўнага адмаўлення ад гэтай ініцыятывы. У Беларусі пра ўкараненне «вокнаў жыцця» ўпершыню загаварылі ў 2009 годзе, аднак законапраект так і не быў прыняты. Зараз краіну накрыла новая хваля дыскусій на гэтую тэму.

З аднаго боку, з'яўленне бэбі-боксаў, дзякуючы іх ананімнасці, павінна прывесці да скарачэння колькасці выкінутых немаўлят і памерлых з-за адсутнасці догляду дзяцей. Аднак досыць вялікі працэнт такіх выпадкаў рэгіструецца ў вёсках і невялікіх гарадах, у кожным з якіх бэбі-бокс, натуральна, не ўсталюеш. А ці гатовыя «маці» абцяжарваць сябе паездкай у адносна буйны населены пункт — яшчэ пытанне. Пры гэтым з жанчын цалкам здымаецца адказнасць за стан дзіцяці: калі на яго целе ёсць раны або пашкоджанні, устанавіць, як гэта адбылося, не ўяўляецца магчымым. Да таго ж ускладняецца працэс кантролю сітуацыі органамі ўнутраных спраў: заўсёды можна засцерагчыся тым, што дзіця не знікла, а было ананімна аддадзена.

**Не хацела станавіцца шматдзетнай маці дзвюх дачок з Пухавіцкага раёна, якая забіла трэцяе дзіця.**

Адразу і да плюсаў, і да мінусаў можна аднесці тое, што нават пры вялікім жаданні такому дзіцяці не ўдасца адшукаць сваіх біялагічных бацькоў. Гэта можа здацца станоўчым бокам для тых, хто збіраецца ўсынавіць немаўля. Магчыма, гэтыя людзі нават гатовыя будуць укласці свае сродкі ў дарагі праект. У ідэале, калі асноўнай функцыяй бэбі-боксаў стане інфармацыйная: жанчыны знойдуць звесткі аб службах падтрымкі і адумаюцца. Але гэта ў ідэале... А пакуль трэба шукаць магчымасці, каб дзецям не даводзілася прасякаць сабе «акно ў жыццё» самастойна.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

### ГЭТА ЎСЁ ЭСТРАГЕНЫ?

Псіхічныя і паводзінскія расстройствы цягам шасці месяцаў пасля родаў сустракаюцца нярэдка, асабліва калі гаварыць аб пасляродавай дэпрэсіі або трывожных станах.

— Пасляродавы псіхоз — цяжкая праява псіхічнага расстройства, але гэта стан досыць рэдкі, сустракаецца літаральна 1-2 выпадкі на 1000 родаў, — адзначае **намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя, кандыдат медыцынскіх навук Ірына ХВАСТОВА**. — Не трэба блытаць псіхоз, які развіўся пасля родаў, з абвастрэннем пасля родаў псіхічнага расстройства, ад якога жанчына пакутавала раней.

Галоўнай прычынай развіцця пасляродавых псіхозаў лічыцца раптоўнае і рэзкае зніжэнне ўзроўню эстрагенаў. Дадаткова, але не асноўны, уклад могуць унесці нейкія псіхалагічныя і сацыяльныя фактары. Рызыка развіцця такіх станаў вышэй у жанчын, якія нараджаюць першынца; у адзінокіх маці; калі роды адбываліся шляхам кесарава сячэння; калі дзіця памерла да або адразу пасля родаў; калі раней роды ўжо суправаджаліся пасляродавым псіхозам. Такі стан суправаджаецца бяссонніцай, нязвыклымі паводзінамі, узбуджэннем, трызненнем і галюцынацыямі. Галоўную ролю ва ўсіх перажываннях іграе непасрэдна нованароджаны — узнікае страх нашкодзіць яму, страшна, што ў яго ёсць нейкія захворванні і г.д. Знаходзячыся ў такім стане, жанчына сапраўды можа нашкодзіць немаўляці.

Па некаторых звестках, рызыка забойства дзіцяці ўласнай маці дасягае ў пасляродавы час 4-х працэнтаў. Вось чаму мы кажам, што жанчыны, якія толькі сталі матулямі, маюць асаблівую патрэбу з боку блізкіх у пяшчоце, клопаце, увазе. Пры першых прыкметах псіхічнага расстройства ім неабходна арганізаваць кансультацыю ўрача-псіхіятра або псіхатэрапеўта.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*